Выпускаецца ў абарачэнне памятны спецштэмпель, які будзе выкарыстоўвацца 6 снежня для правядзення спецыяльнага памятнага гашэння, прысвечанага 100-годдзю Беларускага Дома друку

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне памятны спецштэмпель, які будзе выкарыстоўвацца 6 снежня 2017 года для правядзення спецыяльнага памятнага гашэння, прысвечанага 100-годдзю Беларускага Дома друку.

Месца гашэння - аддзяленне паштовай сувязі № 1 Мінска (крама «Філатэлія», вул. Маскоўская, 16). Да гэтай падзеі РУП «Белпошта» падрыхтавала мастацкі маркіраваны канверт з літарнага маркай «А», тыраж якога 30 тысяч.

У аснове спецштэмпеля і на канверце - лагатып РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку», пры садзейнічанні якога падрыхтаваны праект. Дызайн спецштэмпеля і канверта Алены Мядзведзь

Гісторыя рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі дом друку» пачынаецца 19 снежня 1917 года, калі друкарня былога Мінскага губернскага праўлення была перайменавана ў друкарню Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту

Сёння РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» супрацоўнічае з вядучымі выдавецтвамі і рэдакцыямі Беларусі і іншых краін і з'яўляецца самым буйным паліграфічным прадпрыемствам у рэспубліцы.

Падрабязней на сайце РУП «Белпошта»

Source URL: *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/28-11-2017-2518*